Прамова сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА

на ўсебеларускай нарадзе рэдактароў газэт

I

Ні на хвіліну не забываць аб умацаваньні абароназдольнасьці Савецкага Саюзу

Таварышы! Надыходзячая кампанія перавыбараў партыйных органаў мае ў жыцьці партыйнай арганізацыі і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці вялікае значэньне. У перыяд перавыбарчай кампаніі мы павінны падвесьці вынікі барацьбы за прайшоўшы адрэзак часу за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі нашай партыі, а таксама павінны вызначыць канкрэтныя задачы далейшага практычнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, барацьбы за самыя высокія тэмпы разгорнутага на ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

У сувязі з гэтым неабходна хаця-б коратка спыніцца на некаторых асаблівасьцях перажыванага перыяду. Зусім зразумела, што і ў перыяд падрыхтоўкі і непасраднага правядзеньня перавыбараў партыйных органаў мы ні ў якім разе не павінны ўпускаць пытаньне аб міжнародным становішчы.

Я думаю, што няма патрэбы многа і падрабязна спыняцца на гэтым у выстарчальнай меры знаёмым вам пытаньні. Асноўныя рысы міжнароднай абстаноўкі зараз заключаюцца ў нарастаньні эканамічнага крызісу ва ўсім капіталістычным сьвеце і ўсёй капіталістычнай сыстэме.

На глебе нарастаньня эканамічнага крызісу мы бачым далейшае разгорнутае наступленьне капіталу на жыцьцёвы ўзровень рабочае клясы і ўсіх працоўных. Міжнародная абстаноўка характэрна тым, што ўвесь час выкрышталізоўваецца фашызацыя адной краіны за другой, выкрышталізоўваецца поўнае змыканьне сацыял-фашызму з фашызмам.

Нарастаньне супярэчнасьцяй у краінах капіталу ўвесь час усё больш абвастрае і ўзмацняе падрыхтоўку інтэрэнцыі супроць першай у сьвеце краіны Саветаў. Адным з выразных прыкладаў за апошні час падрыхтоўчай работы да інтэрвэнцыі супроць нас зьяўляецца захват Манчжурыі Японіяй, захват, які азначае стварэньне базы для нападу на СССР з Усходу.

І, урэшце, на глебе становішча, якое стварылася ў капіталістычных краінах, мы маем далейшае нарастаньне рэвалюцыйнага ўздыму ў рабочай клясе, асабліва ў такіх краінах, як Польшча, Германія, Англія, маем павялічэньне ўплыву камуністычных партый на рабочыя масы.

З усёй гэтай надзвычайна кароткай уступнай заўвагі вынікае тое, што мы, краіна Саветаў, павінны, як і раней, працягваць будаваць сваю работу такім чынам, каб улічваць тое магутнае нарастаньне рэвалюцыйнага ўздыму, якое ёсьць у рабочай клясе ўсіх капіталістычных краін, і адначасова ўлічваць падрыхтоўку капіталістаў да інтэрвэнцыі супроць нас.

Вось чаму з асаблівай сілай і настойлівасьцю я хацеў-бы завастрыць вашу ўвагу на надзвычай важнай для партыйнай арганізацыі Беларусі задачы, якая не павінна быць упушчана ў часе перавыбараў партыйных органаў, на задачы далейшага ўмацаваньня абароны Савецкага Саюзу. Задачы ўмацаваньня сувязі з Чырвонай арміяй, канкрэтнай дапамогі і канкрэтнай увагі да штодзённых запатрабаваньняў палітычнага, камандзнага і ўсяго чырвонаармейскага складу — усе гэтыя задачы ў часе надыходзячых перавыбараў партыйных органаў павінны быць намі пастаўлены яшчэ больш моцна, чым да гэтага часу.

Увага да гэтых задач у нас пакуль недастаткова, яўна слабая. Становішча БССР, як бязвога фарпосту Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік на рубяжы з капіталістычным сьветам, усклада на нас перад тварам усяго Савецкага Саюзу, перад тварам рабочае клясы ўсяго сьвету, асабліва адказныя задачы ў справе дапамогі Чырвонай арміі і ў справе ўвагі да пытаньняў далейшага ўмацаваньня абароны нашай краіны.

II

Вастрэй клясавую пільнасьць, яшчэ мацней і напружаней тэмпы ў барацьбе за сацыялізм

Правільная палітыка нашай партыі абязьпечыла буйнешыя зрухі ва ўсёй эканоміцы нашай краіны: наша прамысловасьць заваявала рашаючыя пазыцыі, прыватна-капіталістычны сэктар у галіне прамысловасьці амаль зьведзен да нуля. На лініі калгаснага і дзяржаўнага тандлю мы заваявалі рашаючыя пазыцыі. Прыватнік у галіне тавараабароту па сутнасьці выбіт з усіх пазыцый. І ў барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі мы заваявалі рашаючыя пазыцыі. Калгаснік стаў цэнтральнай фігурай зямляробства, роля бедняка і сярэдняка — аднаасобніка ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці стала другарадная, калгасы і саўгасы адыгрываюць рашаючую ролю ў вытворчасьці сельска-гаспадарчай прадукцыі.

Уступаюць у строй і ўключаюцца ў барацьбу за пабудову сацыялізму дзесяткі новапабудаваных і будуючыхся буйнейшых гігантаў вядучых галін прамысловасьці. З найвялікшай настойлівасьцю і энэргіяй, крок за крокам, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і ле ленінскага ЦК, мы заваявалі на фронце сацыялістычнай індустрыі буйнейшыя перамогі, перамогі, якія неразрыўна, як адно арганічнае цэлае, зьвязаны з вырашэньнем задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, з надвядзеньнем моцнай тэхнічнай базы пад сельскую гаспадарку.

Гэтыя грандыёзныя дасягненьні ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва дасягнуты, зразумела, не самацёкам, гэтыя перамогі дасягнуты ў самай упартай пасьлядоўнай барацьбе перш за ўсё за чыстату генэральнай лініі партыі, у барацьбе з правым ухілам, найбольш небясьпечным на даным этапе, з «левымі» загібам, з рэшткамі контрэвалюцыйнага трацкізму, з прымірэнцтвам да ўхілаў, у барацьбе за няўхільнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, у барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам — галоўнай небясьпекай, з шавінізмамі ўсіх колераў і адценьняў. Гэтыя дасягненьні атрыманы намі ў барацьбе з кулацтвам, у барацьбе за яго ліквідацыю на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Мы павінны ў час перавыбарчай кампаніі разгорнута паказаць нашай партыйнай арганізацыі, усёй рабочай масе і масе калгаснікаў увесь гігантэкі размах нашых дасягненьняў на фронце барацьбы за сацыялістычную індустрыю і сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Але, таварышы, было-б глыбока памылковым на фоне гэтых дасягненьняў лічыць, што задачы, якія перад намі стаяць на далейшае, у якой-бы там ні было меры аблягчэньня або спрашчэньня ў сэнсе тэмпаў нашай далейшай работы, у сэнсе настойлівай барацьбы за далейшыя посьпехі і прасоўваньне наперад. У сувязі з дасягнутымі посьпехамі мы маем адначасовыя ўскладненьні задач, што стаяць перад намі. Гэтыя ўскладненыя задачы зьвязаны з труднасьцямі росту на радзе вуськаў нашага будаўніцтва і патрабуюць далейшага, яшчэ большага напружаньня ўсіх сіл усёй партыйнай арганізацыі ў цэлым, бальшавіцкай адданасьці справе бальшавіцкага напружаньня ў работе на кожным з тых вуськаў, на якім кожны з нас працуе. Гэтыя ўскладненыя задачы і труднасьці росту патрабуюць, каб мы яшчэ мацней ажыцьцяўлялі сувязь з масамі, у яшчэ большай меры мабілізавалі і скарыстоўвалі найвялікшую актыўнасьць, энтузіязм, уздым і творчую энэргію рабочае клясы і ўсіх працоўных для найбольш поўнага, хуткага і якасна высокага выкананьня ўсіх гаспадарча-палітычных задач, што стаяць перад намі.

Разам з ажыцьцяўленьнем чарговых задач бягучага чацьвертага кварталу мы павінны весьці вялікую падрыхтоўку да наступаючага чацьвертага — апошняга году першай пяцігодкі.

Зусім зразумела, што ўсякая работа, якую мы праводзім і ўсякая работа, якую нам трэба будзе праводзіць, — будзе праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Між тым у асобных зьвеньнях раённых партыйных арганізацый, сярод некаторых камуністаў існуюць настрої «почивать на лаврах». Напрыклад, у Крычаўскім раёне сярод некаторых камуністаў існуюць гутаркі накшталт таго, што „бачыце, «кулака мы ліквідавалі, яго ўжо ў вас няма, таму змагацца няма з кім, а клясавай барацьбы ў нас наогул няма».

Наскрозь гнілы і апартуністычны зьмест усіх гэтых «тэорый» зусім зразумелы. У адказ на гэтыя апартуністычныя «гутаркі» неабходна яшчэ больш мабілізаваць партыйную арганізацыю на барацьбу з клясавым ворагам, паказаць на тое, што клясавы вораг канчаткова не дабіт, што ён усімі сіламі, усімі спосабамі імкнецца затармазіць і аслабіць напружаньня тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба кожнаму камуністу растлумачыць і добра зразумець, што клясавы вораг шалёна супраціўляецца нашаму разгорнутаму на ўсім фронце сацыялістычнаму будаўніцтву, што клясавы вораг ўсялякімі спосабамі імкнецца падарваць бальшавіцкія тэмпы барацьбы за хутчэйшае выкананьне пяцігодкі па ўсіх яе якасных і колькасных паказальніках.

Задача кожнай партыйнай арганізацыі, кожнага камуніста ў тым, каб ні на адну хвіліну не супакойвацца на дасягнутых посьпехах, а яшчэ больш узбройвацць, мабілізаваць кожнае зьвяно партыйнай арганізацыі, кожнага камуніста, кожны калектыў рабочае клясы, калгаснікаў, бядняка-сярэдняцкія масы на поўнае выкананьне чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

III

Барацьбу за выкананьне ўказаньняў т. Сталіна—у цэнтр усёй работы

З саматужнай у мінулым нашай прамысловасьці ператвараецца ў прамысловасьць магутную, перабудаваную на новай тэхнічнай базе. У сувязі з магутным ростам прамысловасьці мы маем вялікае папаўненьне радоў рабочае клясы за лік тых новых рабочых, якія не працавалі ў капіталістычных умовах, якія не прайшлі пралетарскай школы, якую прайшоў наш пралетары-кадравік. У сувязі з [illegible] на нашых прадпрыемствах мы маем рад асаблівасьцяй, якія трэба дасканала ўлічыць у перыяд падрыхтоўкі і непасраднага правядзеньня перавыбарчай кампаніі. **Перавыбарчая кампанія павінна быць адначасова непарыўна зьвязана з канкрэтнай далейшай перабудовай усёй нашай партыйнай работы,** з канкрэтнай, глыбокай праверкай таго, наколькі правільна расстаўлены партсілы з тым, каб на справе забясьпечыць поўнае баявое, свячасовае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, з праверкай таго, наколькі партарганізацыя прыстасавала ўсю сваю работу да абслугоўваньня культурна-бытавых запатрабаваньняў рабочых мас, **злучаючы гэта з дыфэрэнцыяваным, дасканалым падыходам да кожнай асобнай выторчай групы** а тым, каб лепш і шырэй скарыстаць невычарпальную ініцыятыву рабочых мас для выкананьня задач, што стаяць перад намі.

Новае папаўненьне, якое нядаўна прыйшло на наша прадпрыемства, прынесла з сабою рад дробна-буржуазных настрояў. З боку асобных адсталых груп рабочых падтрымліваецца сыстэма дробна-буржуазнай ураўнілаўкі, супроць якое мы вядзем і павінны весьці рашучую, бязьлітасную барацьбу. Абязьлічка, расхлябаная работа ка прадпрыемстве — усё гэта зьвязана з парушэньнем працоўнай дысцыпліны, са зрывам усёй работы па выкананьні прамфінпляну.

Мы на лініі прамысловасьці ў бягучым годзе маем значныя посьпехі. У параўнаньні з мінулымі гадамі мы за тры кварталы выпусьцілі валавой прадукцыі больш на 43 проц. супроць тыхжа кварталаў мінулага году. Аднак, значнае перавышэньне плянавых прыёмаў рабочых — перавышэньне плянавых памножэньняў набору рабочай сілы ў некаторай меры змазвае нашу перамогу ў барацьбе за прайфінпляц. Неабходна мабілізаваць увагу на барацьбу з падобнай зьявай, каб яшчэ паўней пры складаньні кантрольных лічбаў вызначыць капіталаўкладаньні ў нашу прамысловасьць, з тым, каб яшчэ больш разьвіваць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы маем рад прадпрыемстваў, якія пядаўна ператвараліся аб датэрміновым выкананьні пяцігодкі за тры гады. Аднак, работу нашай прамысловасьці ў галіне выкананьня прамфінпляну трэба лічыць **нездавальняючай, асабліва ў справе выкананьня якасных паказальнікаў.**

І таму наша ўвага ў перыяд справаздачна-перавыбарчай кампаніі партыйных органаў павінна быць в усёй сілай згрупавана на тым, каб за што-б там ні стала перакрыць тое, чаго мы недавыканалі за мінулыя кварталы трэцяга рашаючага году і поўнасьцю выканаць той план, які мы намячаем на IV квартал.

Няма чаго даводзіць таго, што гэты план рэальны. Гэта ў нас не выклікае ніякіх сумненьняў. Толькі анархісты, якія наогул палохаюцца высокіх тэмпаў, якія «дрэйфяць» перад гэтымі тэмпамі, гаворыць і распускаюць усякія нябыліцы і недарэчнасьці аб нерэальнасьці нашых плянаў. Зразумела, мы маем рад асобных затрудненьняў і па лініі прамысловасьці (нястача сыр-цу па некаторых галінах).

На нядаўна скліканай пры ЦК нарадзе гаспадарнікаў, былі асобныя выступленьні, якія тлумачылі выключна гэтымі труднасьцямі ўсе недахопы работы прамысловасьці. Гэта зусім няправільная, па сутнасьці не бальшавіцкая, пастаноўка пытаньня.

У чым трэба шукаць асноўнае тлумачэньне зрывы недавыкананьня прамысловасьцю БССР свайго прамфінпляну? Асноўнае ў тым, што мы дрэнна перабудавалі работу па лініі прамысловасьці, што ўсё яшчэ на справе не павярнулі да-сапраўднаму прафсаюзы тварам да вытворчасьці, у тым, што кіраўніцтва і перабудова форм і мэтадаў работы партыйных арганізацый у радзе месц нездавальняючыя.

На даным нарадзе я з асаблівай сілай падкрэсьліваю неабходнасьць бальшавіцкай барацьбы за якасныя паказальнікі выкананьня плянаў нашай прамысловасьцю, не процінастаўляючы барацьбы за якасьць тэмпам работы, а наадварот, разгарнуць барацьбу за якасьць такую, каб яна дапамагала павышэньню тэмпаў работы. Барацьба за якасьць ва ўсёй нашай рабоце зьяўляецца важнейшай задачай ўсіх партыйных арганізацый.

Трэба па-новаму кіраваць, канкрэтна кіраваць

У справе перабудовы ўсёй работы мы атрымалі генэральную ўстаноўку ў выступленьні тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў. Як-жа гэтыя ўстаноўкі выконваюцца ў БССР, як-жа мы арганізавалі ўсю работу для таго, каб як можна хутчэй ажыцьцявіць указаньні тав. Сталіна?

На жаль, у гэтым пытаньні ў нас ва многіх зьвеньнях замест напружанай, глыбокай і ва ўсю разгорнутай работы ёсьць **талтаньне на месцы.**

Як па пытаньні аўладаньня тэхнікай (першае выступленьне тав. Сталіна), так і па другім выступленьні тав. Сталіна мы прынялі вялікую колькасьць рэзалюцый, мелі вялікую колькасьць прамоў, кляліся, што падхопім, падтрымаем, ажыцьцёвім і г. д. і г. д. Але гэтым-жа справа не вырашаецца. Аб гэтым гаварыў-жа і тав. Сталін.

Трэба па-новаму кіраваць, канкрэтна кіраваць, трэба жорстка, настойліва і пасьлядоўна правяраць работу, трэба бязьмерна больш навысіць бальшавіцкую адказнасьць за кожнае сьвяно даручаемай работы. Трэба мабілізаваць увагу ўсёй партыйнай арганізацыі на выкананьне дырэктыў, паказаных у прамовах тав. Сталіна. У гэтым зараз галоўнае. Менш гутарак, а больш настойлівай бальшавіцкай справы.

Безалабэрнасьць, расплыўлівасьць, неканкрэтнасьць у кіраўніцтве і недастатковая апэрацыйнасьць, няўменьне перабудаваць работу — зьяўляюцца галоўным тормазам і галоўным вінаватцам таго, што мы на лініі выкананьня прамфінпляну ідзем з нездавальняючымі паказальнікамі. Мы дрэнна мабілізуем усе ўнутраныя рэсурсы для забясьпячэньня выкананьня прамфінпляну.

Дазвольце прынесьці некалькі прыкладаў таго, як-жа мы перабудоўваем ся.

Першае пытаньне — гэта аб перабудове тарыфнай сеткі. Нашы гаспадарнікі і прафсаюзныя працаўнікі да гэтага часу фактычна яшчэ нічога не зрабілі ў справе рашучай барацьбы з дробна-буржуазнай ураўнілаўкай. Нашым гаспадарнікам і прафсаюзным арганізацыям трэба зараз-жа нагнаць прапушчанае, трэба хутчэй практычна ажыцьцявіць перабудову зарплаты, трэба змагацца за лепшую арганізацыю працы. Але, аднак, паўтараю, мы гэтай рашучай барацьбы з ураўнілаўкай да гэтага часу ня маем. Таму задача партыйных арганізацый — гэта пытаньне паставіць у цэнтры ўвагі, падымаючы барацьбу з дробна-буржуазнай ураўнілаўкай на прынцыповую вышыню, барацьбу за арганізацыю працы на прадпрыемствах, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Другое пытаньне — аб адносінах да інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу. У мяне канкрэтных прыкладаў пад рукой няма, але я хачу завастрыць вашу ўвагу на неабходнасьці дабіцца зараз-жа практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб адносінах да інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу, у прыватнасьці, да іх бытавога абслугоўваньня. Трэба рашуча выдаляць і асуджаць кожнае праўленьне спецадзела, трэба мацней біць на фактах няправільнага скарыстаньня інжынэрна-тэхнічных сіл. Трэба поўнасьцю ажыцьцявіць указаньні тав. Сталіна аб падрыхтоўцы новых кадраў пралетарскай тэхнічнай інтэлігенцыі.

Трэцяе пытаньне — аб укараненьні гаспадарчага разрахунку. У нас ёсьць значная колькасьць брыгад, якія лічаць сябе брыгадамі перайнфіўшымі на гаспадарчы разрахунак, але якія па якасьці сваёй работы ні ў якай меры не адпавядаюць тым патрабаваньням, што прад'яўляюцца кожнай брыгадзе, якая перайшла на гаспадарчы разрахунак. Яўна неадпаўняючыя і на сёньняшні дзень стаіць справа з укараненьнем гаспадарчага разрахунку ў значнай частцы нашых прадпрыемстваў. На прадпрыемствах у сэнсе непасраднага практычнага ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку справа кепская, і мы павінны ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі рашуча перабудаваць нашу работу так, каб сапраўды скарыстаць гаспадарчы разрахунак, як магутную зброю барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Такім чынам справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна быць непарыўна зьвязана з задачай выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну і з задачай канцэнтраваньня вялізарнай увагі на поўным выяўленьні і мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў.

Барацьба за бальшавіцкую работу транспарту—справа ўсёй партарганізацыі

Чацьвертае пытаньне — аб транспарце. Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР дала вычарпальную ацэнку работы транспарту. Мы нядаўна на сакратарыяце ЦК КП(б)Б заслухалі даклад Віцебскага чыгуначнага раёну і вынесьлі пастанову, якая апублікавана ў друку. Мы прынялі работу гэтага чыгуначнага раёну нездавальняючай. Становішча Віцебскага раёну характэрна і для станоўкіна другіх чыгуначных раёнаў Беларусі, у прыватнасьці, асабліва вялікая нятвёрдасьць работы назірэцца па Заходняй чыгунцы.

Асеньня-зімовыя перавозкі прад'яўляюць вялізарныя значна павышаныя патрабаваньні транспарту. Ня гледзячы на тое, што партыйная арганізацыя многа гаварыла аб гэтым, аднак, транспартная партыйная арганізацыя спазьнілася і зусім дрэнна падрыхтавалася да асеньня-зімовых перавозак.

У сувязі з такой нятвёрдай дрэнна работай транспарту мы маем вялікія прабелы і простыя ўдары па асобных вучастках і нашай гаспадарцы ў цэлым.

Таму перавыбары партыйных органаў як і ўся работа партыйных арганізацый у бліжэйшы час павінна канцэнтраваць сваю ўвагу на барацьбе за нармальную бесьперабойную работу транспарту, за самае поўнае і правільнае скарыстаньне кожнага паравозу, кожнага вагону. Трэба ўстанавіць такі кантроль з боку дырэкцыі і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, пры якім ні адзін вагон ня мог-бы на чыёй-бы там ні было віне прастаяць. Трэба паставіць так справу, каб кожнае зьвяно чыгункі адчувала на кожным кроку кантроль з боку ўсёй партыйнай арганізацыі, з боку ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. Трэба рашуча ўдарыць па бюракратызьме, які мае яшчэ шырокае распаўсюджаньне ў рабоце чыгункі.

Будаваць ня толькі летам, але і зімою

Пятае пытаньне — аб будаўніцтве. Бюро ЦК КП(б)Б прынята ўстаноўка на тое, каб не распылять будматар'ялаў і сілы, а ўсю ўвагу згрупаваць па першачарговых і важнейшых будаўнічых аб'ектах.

Па пытаньні аб будаўніцтве можна было-б многа гаварыць і аб якасьці і аб радзе другіх хваравітых пытаньняў. Тут у адносінах барацьбы за самыя высокія колькасныя і якасныя паказальнікі трэба таксама рашуча перабудаваць. У нас увайшло ў прывычку, што будаўнічы сэзон канчаецца ўвосень, а зімой можна адпачыць, можна нічога не рабіць.

Ва ўмовах Беларусі пры нашых марозах, якія слабей сібірскіх, драўляное будаўніцтва можна і трэба весьці разгорнутым парадкам круглый год. Трэба так арыентаваць партыйную арганізацыю і ўсю грамадзкасьць, каб не дапускаць дэмабілізацыйных настрояў у пытаньні аб тэрміне сканчэньня будаўнічага сэзону. Трэба будаваць зімой, тым больш драўляныя стандартныя дамы, і мы будзем гэта рабіць самым разгорнутым парадкам.

IV

Павернем каапэрацыю тварам да канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва

Наступнае пытаньне — аб рабочым забясьпячэньні, увага да якога з нашага боку павінна быць асабліва вялікай.

Пэрспэктывы рабочага забясьпячэньня на IV квартал па радзе прадуктаў, якія мы маем магчымасьць атрымаць у сябе ў нашых умовах, значна паляпшаецца. Па лініі рабочага забясьпячэньня мы маем значны зрух. Аднак, далейшае паляпшэньне пастаноўкі работа забясьпячэньня патрабуе бязьмерна большай увагі ўсёй партарганізацыі да справы перабудовы каапэрацыі і органаў снабжэньня.

Трэба зьвярнуць асабліва пільную ўвагу на дасканальны кантроль за выдаткаваньнем і разьмеркаваньнем прадуктаў, на ліквідацыю ўраўнілаўкі і абязьлічкі ў справе рабочага забясьпячэньня. Таксама моцна павінна быць пастаўлена задача мабілізацыі ўсіх мясцовых рэсурсаў. Мы атрымліваем плянавыя вантыляцыі, мы бязумоўна маем магчымасьці павялічыць снабжэньне рабочых мас за лік больш поўнай і свячасовай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Трэба ў прыватнасьці зьвярнуць асаблівую ўвагу на такія пытаньні, як, напрыклад, на ажыцьцяўленьне адкормачных апэрацый.

Напружанае становішча і ў IV квартале і ў наступных кварталах у рабочым забясьпячэньні будзе ў нас в тлушчамі і мясам. Таму пытаньне мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, асабліва разгортваньне адкормачных апэрацый, рашучая барацьба супроць усялякага заціску здаровай ініцыятывы нашых сельпо, ЗРК і г. д., у прыватнасьці, у арганізацыі адкормачных апэрацый — павінна прыцягнуць асаблівую ўвагу. Напрыклад, мы павінны ў корані ліквідаваць тое становішча, якое мы маем зараз у БССР у галіне рыбнай гаспадаркі. Рыбы ў БССР у галіне рыбнай гаспадаркі. Адпускаецца на лоў у Беларусі многа. Адпускаецца на лоў рыбы многа снасьцей, прылад і г. д., але рыбы многа снасьцей мы не атрымліваем, бо ўлоў рыбы разбазарваюць на месцы.

Таму, таварышы, мы ставім адной з цэнтральных задач у рабоце па забясьпячэньні, асабліва па лініі забясьпячэньні тлушчамі, задачу мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў (адкормачныя апэрацыі, рыба і г. д.).

Кажучы аб неабходнасьці ўсялякага падтрыманьня нізавых зьвеньняў каапэрацыі ў справе іх непасраднага прыцягненьня да самых заготавак, трэба бязьлітасна выкрыць апортуністычную сутлітасна выкрыць апортуністычную сутлітасна выкрыць, якія ёсьць сярод асобных працаўнікоў, што допуск нізавых працаўнікоў, што допуск нізавых працаўнікоў, ня дапускаюць нізавых працаўнікоў, ня дапускаюць нізавых працаўнікоў, у самай рашучай ліквідацыі абязьлічкі, у разгортваньні сацсаборніцтва і ўдарніцтва, як асноўных мэтадаў штодзённай барацьбы за далейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва.

З пытаньняў калгаснага руху мне хацелася-б некалькі спыніцца на пытаньні аб разьмеркаваньні ўраджаю. На практыцы ўжо зараз мы сустракаем цэлы рад скажэньняў. Па гэтым пытаньні ўстаноўка адпаведная дана. Зараз задача заключаецца ў тым, каб партыйная арганізацыя надала сапраўды буйное палітычнае значэньне пытаньню разьмеркаваньня ўраджаю, як важнейшаму зьвяну ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Зараз часта сустракаюцца тэндэнцыі да правядзеньня ўраўнілаўкі, а ў асобных калгасах з боку маладых нядаўніх калгаснікаў праяўляюцца імкненьні пайсьці на «сваю палоску» зьбіраць ураджай. Гэтыя імкненьні індывідуалістычнага парадку вынікаюць з работы, разгорнутай кулакоў, які ўсімі сіламі і сродкамі імкнецца сарваць справу правільнага разьмеркаваньня ўраджаю. На пытаньні прынцыпаў разьмеркаваньня ўраджаю кулак стараецца зараз разлажыць, разбурыць з сярэдзіны асобныя калгасы, стараецца пасеяць сярод калгаснікаў усялякія сумненьні. Нам неабходна ва ўсёй нашай сучаснай штодзённай рабоце выходзіць з тэй установкі, што **арганізацыя правільнага разьмеркаваньня ўраджаю зьяўляецца адным з цэнтральных па сутнасьці пытаньняў у справе ўзмацненьня калгасаў.**

Зараз аб барацьбе за сацыялістычную жывёлагадоўлю. Адозва ЦК УсеКП(б), СНК і ЦК КП(б)Б устанаўляе, што 1932 год зьявіцца рашаючым у пытаньні барацьбы за сацыялістычную жывёлагадоўлю. Ва ўмовах БССР жывёлагадоўля, асабліва сьвінагадоўля, зьяўляецца рашаючай у справе ўмацаваньня нашай гаспадаркі. Мы зараз у ЦК КП(б)Б вырашаем цэлы рад практычных пытаньняў на жывёлагадоўлі, выклікаючы і заслухоўваючы адпаведных працаўнікоў і ўстановы. Трэба сказаць, што мы яшчэ не павярнуліся як сьлед да пытаньняў барацьбы за жывёлагадоўлю. Кожны сакратар райкому партыі, кожны сакратар райкому камсамолу, увесь партыйны і камсамольскі актыў павінны ведаць на зубок усе пытаньні, зьвязаныя з жывёлагадоўляй, бо толькі пры ўмовах мабілізацыі ўвагі і сіл усёй партыйнай арганізацыі можна на справе, практычна змагацца за карэннае паляпшэньне жывёлагадоўлі.

Сорамна павінна быць таму сакратару райкому, таму рэдактару газэты ці іншаколькі ў раёне штук стада, колькі ўпадку, колькі сьвінаматак і іншых пытаньняў жывёлагадоўлі. А ў нас часта бывае так, што сакратар райкому бездапаможнае на хлопае вачыма, калі яму задаеш пытаньне аб тым, колькі-ж злучана сьвіней, колькі ёсьць аходу, колькі ўпадку і г. д. Для таго, каб вырашаць гэтае пытаньне па-канкрэтнаму, па-баявому, так, як да гэтага нас абавязвае партыя, то трэба брацца канкрэтна за гэту работу, трэба канкрэтна і апэрацыйна ёю кіраваць.

На надыходзячым пленуме ЦК КП(б)Б ставіцца спэцыяльна пытаньне аб жывёлагадоўлі з тым, каб намецінь рад практычных мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі пералом, у прыватнасьці, у справе арганізацыі працы, упарадкаваньня тарыфнай сеткі, лепшага забясьпячэньня працаўнікоў, якія даглядаюць на сьвінямі і рад іншых стымулюючых мер.

Трэба рашуча змагацца з існуючымі спажывецкімі настроямі, з настроямі разбазарваньня. Плян заготовак па каровах, з якім трудней справа, у нас перавыконваецца, а па заготоўцы сьвіней плян у нас выкананы ўсяго толькі на 30 проц.

Сьвіньні ў калгасах і ў аднаасобным сэктары ёсьць, але, з прычыны таго, што мы дрэнна змагаемся са спажывецкімі настроямі, атрымліваецца становішча, што плян заготовак ня выконваецца. Зусім зразумела, што ў справе вырашэньня жывёлагадоўлі такія пытаньні, як будаўніцтва сьвінарнікаў, камплектаваньне стадаў і г. д. павінны быць у цэнтры увагі.

Адносна тэхнічных культур. Мы больш-менш пасьпяхова сабралі лён. Зараз мы ўступаем у самы адказны этап, які ў значнай меры будзе вырашаць далейшыя посьпехі ў пасеве ільну. **Гэты этап заключаецца ў заготоўцы і апрацоўцы ільну.** Мы пабудавалі рад заводаў. Частку апрацоўкі мы будзем рабіць на гэтых заводах, але асноўная апрацоўка ільну ўсё яшчэ будзе праводзіцца больш прымітыўнымі спосабамі непасрэдна ў калгасах і аднаасобным сэктары. **Трэба дабіцца, каб гэты адсектары. Трэба дабіцца, каб гэты адяго заготоўкі быў-бы на што-б там ні стала вырашаны па-баявому.** Гэта будзе вырашаць і посьпехі вызначанай на будучы год пашыранай праграмы пасеваў.

Неабходна на даным нарадзе падкрэсьліць пытаньне аб заготоўках. Выкананьне гадавых плянаў заготовак па сёньняшні дзень зьяўляецца незадавальняючым. Мы адсталі ў галіне заготовак збожжа, бульбы, жывёлы, ільнасемя і інш. заготовак. Такое адставаньне недапушчальна, яно дрэнна адбіваецца на выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных задач, што стаяць перад намі.

Прычынай адставаньня ў заготоўках зьяўляецца тое, што заготоўчыя арганізацыі, партарганізацыі, калгасная і асабліва саўгасная сыстэма не разгарнулі па-баявому работы і не адносьліся да заготовак, як да важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы. У пытаньні аб заготоўках існуюць у радзе раёнаў антыпартыйныя настрої, імкненьні спачатку забясьпечыць сябе, а потым, што застанецца,—здаць дзяржаве, імкненьні, якім вельмі часта не дасцца рашучага і бязьлітаснага адпору.

Нам неабходна дабіцца неадкладнага, рэзкага і рашаючага пералому ў галіне заготовак, зламаць супраціўленьне кулацтва, рашуча ўдарыць на ўсялякіх настроях аб пераважнасьці плянаў, дабіцца таго, каб пляны ў галіне заготовак збожжа, бульбы, ільну, фінплян і правядзеньне такой важнейшай справы, як жывёлка, — каб усе гэтыя мерапрыемствы былі ў тэрмін на-баявому і поўнасьцю выкананы. Гэтага мы павінны дабіцца і абавязкова дабіемся.

У сувязі з заготоўкамі я хацеў-бы спыніцца на трох пытаньнях аб цьвёрдых заданьнях заможна-кулацкай частны вёскі, аб спажывецкіх настроях і барацьбе з імі і аб „тэорыі чарговасьці кампаніі“.

У нас ёсьць мала раёнаў, якія сапраўды вычарпальна ведаюць, колькі ў раёне ёсьць кулакоў і заможных і колькім з іх даны цьвёрдыя заданьні. Трэба адзначыць, што ў некаторых раёнах ёсьць нерагібы ў адносінах дачы цьвёрдых заданьняў середняком. У асноўным-жа ў нас наступны малюнак: пасьля таго, як цьвёрдыя заданьні даны, потым гэтыя заданьні агулам пераглядаюцца, потым іх яшчэ раз пераглядаюць і атрымліваецца замест канцэнтрацыі рашучага ўдару па кулацка-заможнай частцы за хутчэйшае і поўнае выкананьне цьвёрдых заданьняў, блытаніна і адцяжка. У выніку такой адцяжкі і блытаніны ў справе ўстаноўленьня цьвёрдых заданьняў у кулацка-заможная частка пачынае разбазарыць сваю прадукцыю.

У Рэчыцкім раёне, напрыклад, «цьвёрда-хаданьнікі» падалі заявы аб зьмяншэньні заданьня, раённыя ўстановы [illegible] рудзяць з разглядам заяў, а надаўна [illegible] заяву кажуць: «Мы заявы падалі і, калі не разьбяруць, ня будзем здаваць». Рэчыцкія-ж таварышы замест таго, каб больш хутка і рашуча ўдарыць па гэтых спробах сарваць выкананьне заданьняў, пачынаюць вазіцца з кулаком і ў выніку аб'ектыўна атрымліваецца простае папушчэньне кулаку.

Цяпер аб спажывецкіх настроях.

Мы маем у радзе калгасаў і ў радзе асобных раёнаў даволі шырока распаўсюджаныя т. зв. спажывецкія настрої. Гэтыя настрої заключаюцца ў тым, што рад калгасаў у заготоўках трымаюцца правіла: «спачатку себе, а потым дзяржаве». Складаюцца дутыя збожжафуражныя балянсы, няправільныя акты аб ураджайнасьці — усё гэта робіцца для таго, каб менш здаць (прадаць) дзяржаве. Як мы павінны падыходзіць да ацэнкі гэтых настрояў?

Гэтыя спажывецкія і рвацкія настрої стварацца кулацтвам для таго, каб разбурыць калгасы з сярэдзіны, сарваць арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Гэта ёсьць новая тактыка клясавага ворага. Толькі так мы павінны падыходзіць да ацэнкі спажывецкіх і рвацкіх настрояў і ў адпаведнасьці з гэтым разгортваць рашучую і бязьлітасную барацьбу з імі.

Трэба сказаць, што і калгасная сыстэма ў даволі пашыраных формах гэтых настрої падтрымлівае. Мне сёньня расказвалі, што Белкалгасцэнтр і Трактарацэнтр разаслалі дырэктывы аб складаньні збожжафуражнага балянсу такім, што калгасы, дзе арганізоўваюцца таварныя фэрмы, нічога дзяржаве здаваць не павінны, і акрамя таго ў дырэктывах паказваецца на тое, каб у першую чаргу бранініраваліся кармовыя фонды без уліку пляну заготовак. Калі такія дырэктывы ёсьць, гэта няправільна і на такіх няправільных указаньнях трэба рашуча ўдарыць.

Нека

Прамова сакратара ЦК КП(б)Б т. Шаранговіча

На ўсебеларускай нарадзе рэдактароў газэт

Наступнае пытаньне аб апартуністычнай «теорыі» чарговасьці кампаній.

У нас у IV квартале скапіўся рад вузлавых важнейшых задач, якія мы павінны рашуча і ў тэрмін ажыцьцявіць: арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, барацьба за жывёлагадоўлю і адсюль за стварэньне кармовай базы, барацьба за тэхнічныя культуры, выкананьне заготовак, фінансавага плану, дарожнае будаўніцтва, зяблева і г. д. (Гэта тыя пытаньні, якія маюць дачыненьне да вёскі).

Што-б атрымалася, калі-б ажыцьцявілі «рецэпт» апартуністаў аб чарговасьці кампаній, калі кажуць, давайце рабубульбу раней, а потым зяблева, ці давайце возьмемся за загатоўкі збожжа, а потым за бульбу і г. д.

Атрымаліся-б не бальшавіцкія тэмпы работы, а такія тэмпы, якія-б былі на руку клясаваму ворагу. «Теорыя» чарговасьці кампаній ёсьць самая апартуністычная тэорыя і ў корані супярэчыць барацьбе за высокія тэмпы нашага будаўніцтва.

Напружаньне, якое мы маем у IV квартале, — вялікае, але партыйная арганізацыя павінна ўлічыць і павінна асвоіць усё гэта, мабілізаваўшы ўсе людзкія матар'яльныя рэсурсы на тое, каб усе гэтыя задачы былі ў тэрмін і поўнасьцю выкананы па ўсіх колькасных і якасных паказальніках.

VI

За разгорнутую масавую работу, за разгорнутую пралетарскую самакрытыку, супроць голага адміністраваньня

ЦК КП(б)Б ускрыў за апошні час у радзе раённых арганізацый (Лельчыцы, Бягомль, Пленчаніцы, Асьвея) рэд агідных зьяўішч. Толькі ўчора мы разглядалі ганебныя факты, якія мелі месца ў Чырвонапольскім раёне. Мы ўскрылі поўнае ігнараваньне масавай работы і вялізарнае адміністраваньне. Наглядзелі масавая палітычная работа падмянялася вялізнымі дозамі голага адміністраваньня ў адносінах да аднаасобнага сяктара, у адносінах да беднякоў і сераднякоў.

Выкрытыя намі за апошні час факты гавораць аб тым, што неабходна яшчэ больш рашуча, у самай вострай форме ўдараць па існуючых фактах голага адміністраваньня. У Вушацкім раёне, напрыклад, бяз ведама СНК БССР была абвешчана працуцыпавіннасьць па ўборцы бульбы. У даным канкретным выпадку вушацкія таварышы пайшлі на ліні найменшага супраціўленьня, па лініі падмены масавай пагыбленай работы адміністраваньнем. Або ў Чавускім раёне РВК вынес пастанову, у якой вызначае тэрміны, калі бядняк, серадняк і заможны павінны выканаць у намечаныя тэрміны ўборку бульбы, а калі заданьне ня будзе выканана, то на беднака накладаецца штраф у 25 руб., на сераднякa—50руб., на кулака—100 руб. Адным словам, чавускія таварышы голае адміністраваньне злучаюць з... «клясавым падыходам» (да рэчы, нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладзен на начальніка міліцыі).

І зараз у поўнасьці зразумелым зьяўляецца для нас тое, чаму ў Чавускім раёне выкананьне ўсіх кампаній прахадзіць надзвычай дрэнна. Аднак, зьвернемся да пытаньня аб тых скажэньнях, якія мелі месца ў Чырвонапольскім раёне.

Мы распусьцілі бюро Чырвонапольскага райкому партыі, прэзыдыум РВК і прэзыдыум РКК.

Вывад з усіх гэтых прыведзеных прыкладаў наступны: мацней, больш настарожанай неаслабную клясавую чуласьць да ўсіх праяўленьняў клясавай барацьбы.

Яшчэ больш жорстка і настойліва працягваць, весьці неаслабную барацьбу з клясавым ворагам і яго агентурай унутры партыі—правым апартунізмам, «левым» загібам і прымірэнцтвам да якіх-бы там ні было адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі, рашуча вычышчаючыся ад асобных нягодных камуністаў, выкрываць і ачышчаць ад кулацкіх элемэнтаў і іх падпявал.

Шырэй разгортваць пралетарскую самакрытыку, за яе дзейснасьць, шырэй разгортваць пагыбленую масавую работу.

VII

Асаблівы ўпор на практычным ажыцьцяўленьні авангарднай ролі камуністаў

гэтыя сілы выконваюць заданьні партыі.

Адным з групы важнейшых пытаньняў зьяўляецца пытаньне аб узмацненьні вясковай партыйнай арганізацыі, аб расстаноўцы яе сіл. У некаторых таварышоў ёсьць думка, што ў нас уся вясковая партыйная арганізацыя вельмі слабая, што яна нічога ня варта, што ў вясковай партыйнай арганізацыі няма такіх сіл, якія-б мы здолелі як сьлед мабілізаваць і расставіць.

Відома, што вясковая партарганізацыя яшчэ слабая і патрабуе прыняцьця раду мер да яе ўзмацненьня, але гэтак абагульваць — няправільна.

Я думаю, што падобная пастаноўка пытаньня павінна палітычна быць кваліфікавана, як апартуністычная пастаноўка. Мы ў вясковай партыйнай арганізацыі маем значныя кадры, якія выкаваліся ў клясавай барацьбе ў абстаноўцы жорсткіх баёў з кулацтвам, якія выкаваліся ва ўмовах сапраўднай барацьбы за калектывізацыю, за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Трэба, урэшце, ва што-б там ні стала адмовіцца ад няправільных тэндэнцый, калі кажуць, што дайце людзей з гораду, што няма працаўнікоў, і вось я прыду ў ЦК, напрашу і мне дадуць. Мы павінны паставіць справу так, каб дабіцца рашучага паваротаў ў справе выхаваньня новых кадраў на месцы, з рабочых, з калгасьнікаў, трэба сьмялей прасоўваць іх на кіруючую савецкую, калгасную і інш. работу. Трэба аспоўныя кадры для вясковай партыйнай арганізацыі рыхтаваць на месцы, рыхтаваць з мясцовых таварышоў.

Цяпер аб расстаноўцы партсіл. Ці маем мы магчымасьці маневраваць хоць-бы ў вёсцы, у адносінах расстаноўкі нашых сіл? Маем. Трэба толькі гэта арганізаваць. Я катэгарычна ня згодзен з устаноўкай, якая ёсьць у артыкуле т. Галодка, зьмешчаным у апошніх нумары часопісі «Бальшавік Беларусі». Тав. Галодка піша: «Правільная расстаноўка сіл і забесьпячэньне кожнага вучастку партыйцамі ўпіраецца ў такі факт, што нашы вясковыя партыйныя арганізацыі якасна і колькасна слабыя».

Па т. Галодка выходзіць, што калі ў нас колькасна і якасна слабая партыйная арганізацыя і няма чаго правільна расстаўляць, значыць, каравул крычы. Ня ведаю, ці прадумаў як сьлед т. Галодка свой артыкул; калі ён прадумаў (а т. Галодка часта езьдзіць у вёску) і калі гэтыя ўстаноўкі выцякаюць з выкрышталізаваных на гэтым пытаньні думак, то прыдзецца яму яго думкі грунтоўна направіць. Калі-ж т. Галодка напісаў, не прадумаўшы пытаньня да канца, то трэба каб сам аўтар выправіў гэту сваю буйную палітычную памылку.

Мы павінны пры перавыбарах партыйных органаў асабліва завастрыць увагу на далейшым умацаваньні вясковых партыйных арганізацый, на правільнай і гібкай расстаноўцы ўсіх сіл, якія мы маем у вёсцы, у раёне і асабліва завастрыць увагу, прыняўшы рад канкрэтных мерапрыемстваў на ўмацаваньне работы апорных пунктаў у вёсцы—сельпарткомаў. Гэта забясьпечыць і пасьпяховае выраўнаньне чарговых гаспадарча-палітычных кампаній і канкрэтнае спэцыялізаванае кіраўніцтва калгасамі, гэта ў агульным выніку яшчэ больш павысіць бальшавіцкую баяздольнасьць вясковай партыйнай арганізацыі.

Вось таварышы, пытаньні, якія я хацеў коратка закрануць у сваім выступленьні на вашай нарадзе. Я ня спыняюся на пытаньнях росту і г. д. аб гэтым казаў ўжо ў сваім дакладзе т. Гурэвіч.

VIII

Кіраўніцтва рабселькорамі і нізавым друкам--адна з першачарговых задач усёй КП(б)Б

Перад тым, як кончыць сваё выступленьне, я хачу сказаць адносна нашага друку. Думаю, што практычныя працаўнікі будуць на гэтым пытаньні гаварыць падрабязна. Зразумела, што задачай нашага друку раённых і цэнтральных газэт заключаецца ў тым, каб у часе правядзеньня перавыбараў партыйных органаў мабілізаваць увагу ўсёй партыйнай арганізацыі, усёй пралетарскай грамадзкасьці на выкананьне чарговых гаспадарча-палітычных задач. Зусім зразумела, што ўвага органаў друку і ўсёй армії рабселькораў павінна яшчэ больш быць мабілізавана на павышэньне клясавай чуласьці. Само сабой зразумела, што друк сваю увагу павінен накіраваць на выяўленьне і выкрыцьцё тых скажэньняў, якія мы маем у рабоце асобных органаў і арганізацый і г. д. Само сабой зразумела, што друк, даючы разам з гэтым разгорнуты паказ станоўчых узораў работы, ва ўсёй сваёй рабоце павінен ад пачатку да канца, выходзіць з неабходнасьці барацьбы за высокія напружаныя тэмпы работы, якія мы маем у IV квартале і ў сувязі з падрыхтоўкай да новага гаспадарчага году.

Як і раней першачарговымі задачамі для ўсяго нашага друку зьяўляецца ажыцьцяўленьне ў сваёй рабоце выразнай апэрацыйнасьці і ажыцьцяўленьне спэцыялізацыі ва ўсёй рабоце. Работа друку павінна быць пастаўлена так, каб самыя аспоўныя, рашаючыя пытаньні, на якіх павінна быць сканцэнтравана ўвага партарганізацыі і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, ніяк не выпадалі з-пад увагі друку, каб друк па гэтых пытаньнях сыстэматычна і глыбока, а не ў асобных выпадках, мабілізаваў-бы ўвагу ўсёй партыйнай арганізацыі, усёй пралетарскай грамадзкасьці.

Мне-б хацелася з асаблівай сілай завастрыць увагу ўсёй партыйнай арганізацыі і ў прыватнасьці ўвагу цэнтральных, раённых, шматтыражных і насьценных газэт на пытаньнях кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам.

ЦК КП(б)Б вызначае шмат увагі пытаньням кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам. Між тым, матар'ялы сыгналізуюць аб тым, што з боку раду цэнтральных газэт у знатнай частцы рённых газэт і райпартарганізацый за апошні час значна аслабла сыстэматычная штодзённая работа з рабселькорамі і нізавым друкам.

У нас ёсьць рад важнейшых дакумантаў ЦК КП(б)Б па пытаньнях рабселькораўскага руху, раённага і нізавога друку і ў падрыхтоўцы кадраў для друку. Зараз мы разам з ЦКК КП(б)Б агрунтуем асабліва сур'ёзную ўвагу на здзяйсьненьні масавай праверцы ўсіх раней прынятых партыйных пастаноў па пытаньнях друку і рабселькораўскага руху.

Ва ўсёй рабоце па ацэнцы якасьці работы партыйных арганізацый і ў прыватнасьці рэдакцый газэт, а таксама прафсаюзных арганізацый, гаспадарнікаў і г. д. на пытаньнях рабселькораўскага руху мы выходзім і будзем выходзіць з таго, што самае дробнае праяўленьне недаацэнкі рабселькораўскага руху, нізавога друку і неабходнасьці ўмацаваньня партыйнага кіраўніцтва імі, павінна палітычна кваліфікавацца, як праяўленьне правага апартунізму на практыцы.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове (ліпень 1931 г.) **пастанавіў правесьці разам з ЦККК КП(б)Б у лютым месяцы 1932 году масавы ўсебеларускі месячнік праверкі і самаправеркі выкананьня пастаноў партыі аб друку і рабселькораўскім руху. Тры месяцы, што засталіся да месячніка, павінны быць выкарыстаны для таго, каб нагнаць прапушчанае,** у прыватнасьці забясьпечыць не парадную, а глыбокую, спэцыялізаваную па групах вядучых прафэсій, прапрацоўку і рэалізацыю пастаноў II ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду.

Неабходна на справе дабіцца выкананьня неадназразовых указаньняў ЦК КП(б)Б аб тым, **ШТО РАБОТА З РАБСЕЛЬВАЕНКОРАМІ, ДАПАМОГА І КІРАЎНІЦТВА НІЗАВЫМ ДРУКАМ, БАРАЦЬБА ЗА ДЗЕЙСНАСЬЦЬ УСІХ ЗЬМЯШЧАЕМЫХ У ДРУКУ МАТАР'ЯЛАЎ, ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДНЭЙ З ПЕРШАЧАРГОВЫХ ЗАДАЧ УСЁЙ КП(б)Б КОЖНАЙ РАЁННАЙ І ГАРАДСКОЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, КОЖНАЙ ЗАВОДСКАЙ І КАЛГАСНАЙ ЯЧЭЙКІ.**

Таварышы! Я канчаю. Выкананьне ўсіх гэтых задач, аб якіх я гаварыў, магчыма толькі пры няўхільным ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі. Мы правялі вялікую, разгорнутую барацьбу з правым ухілам, з яго праяўленьнямі ў практычнай рабоце, мы білі і б'ем па праяўленьнях «левага» апартунізму. Аднак, за апошні час мы маем рад адкрытых праяўленьняў правага апартунізму. Усе гэта сьведчыць аб тым, што барацьба за чыстату генэральнай лініі партыі, за яе практычнае ажыцьцяўленьне павінна праводзіцца з яшчэ большай сілай і энэргіяй. Згрупаваць увагу на барацьбе з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, з «левым» апартунізмам, з усялякімі праяўленьнямі прымірэнцтва — вось задача, якая павінна стаць у цэнтры ўвагі кампаніі перавыбараў партарганаў.

(Працяжныя аплёдысмэнты).



Днепрабуд. Частка плаціны.

Загатоўлена толькі 4 тоны ільнасемя

РАСОНЫ. Да ільназагатовак у Расонскім раёне пачалі рыхтавацца са сьпазьнем. Пляны спушчаны ў сельсаветы, толькі ў ваны верасьня. Да калгасу і вёсак **пляны яшчэ не даведзены.** Кулацка-заможным гаспадаркам цьвёрдыя заданьні ня даны.

Непадрыхтаваны і пункты для прыёмкі ільнавалакна: **замест 6 зараз ёсьць толькі 3 пункты.**

Масавай работы закол загатовак не вядзецца. У выніку жулак, які не атрымаў цьвёрдага заданьня, вядзе падрыўную работу, накіраваную на зрыў загатовак.

Дагэтуль паступіла **толькі 4 тоны** ільнасемя і ніводнага цэнтнэра ільнавалакна. Ільнатраста ўадымаецца, а пераапрацоўка ільну і задача прадукцыі дзяржаве алачына **зацягваецца.**

Раённыя кіруючыя арганізацыі неадкладна павінны прыняць самыя рашучыя меры да ліквідацыі гэтых ірарыўаў і забясьпечыць масавае разгортваньне перапрацоўкі ільну і загатовак.

Булкін.

Гаспадарча-разрахунковыя брыгады „Бальшавіка" правяраюць падрыхтаванасьць свайго заводакіраўніцтва

Да пачатку новага парадку крэдытаваньня засталося 4 дні

Перадавікі-ўдарнікі сваім актыўным умяшаньнем паскораць ажыцьцяўленьне дырэктывы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР

Брыгады гаспадарчага разрахунку іншых прадпрыемстваў павінны пасьледаваць бліскучаму прыкладу ўдарнікаў „Бальшавіка"

Ахопленая энтузіязмам будаўніцтва сацыялізму, рабочая кляса Савецкага Саюзу шукае ўсё новыя формы найбольш пасьпяховага, актыўнага і пепа среднага ўдзелу ў выкананьні ўсіх гаспадарча - палітычных задач, якія высоўваюць партыя і ўрад. Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб новым парадку крэдытаваньня знайшла водгук у шырокіх працоўных масах. Асабліва зацікавіліся гэтым пытаньнем **гаспадарча-разрахунковыя брыгады,** якія зусім правільна лічаць сваім ударным абавязкам ня толькі з посьпехам выконваць сацыялістычныя гаспадарча - разрахунковыя дагавары, але **прымаць актыўны ўдзел у ажыцьцяўленьні тых мерапрыемстваў, якія вызначаюць партыя і ўрад для ўзмацненьня гаспадарчага разрахунку наогул — гаспадарчага разрахунку прадпрыемстваў і гаспадарчых аб'яднаньняў.**

Выходзячы з гэтага, дзьве гаспадарча-разрахунковыя брыгады гарбарні **«Бальшавік» — брыгада рамшчыкаў першага хромавага цэху і брыгада строгаляў другога хромавага цэху ў колькасьці 12 чал. 26-га кастрычніка пасьля работы арганізавалі праверку таго, як заводакіраўніцтва і бухгальтарскі апарат падрыхтаваліся да новага парадку крэдытаваньня.**

Удзельнікі праверкі паставілі перад намесьнікам дырэктара і галоўным бухгальтарам рад пытаньняў: ці гатоў баланс на 1-га кастрычніка, ці зацьверджаны зваротныя сродкі, што новага ўносіць апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у работу прадпрыемства, якую дапамогу могуць аказаць гаспадарча-разрахунковыя брыгады і г. д.

Брыгады выявілі, што сума зваротных сродкаў заводакіраўніцтва вызначана, але не зацьверджана. Скараб'яднаньнем, што баланс на 1-га кастрычніка яшчэ не гатоў, што новы парадак крэдытаваньня значна павялічвае адказнасьць усяго прадпрыемства ў цэлым і кожнага ўдарніка паасобку за справу сацыялістычнага накапленьня, за эканомнае выдаткаваньне матар'ялаў і сьрэдстваў, за выкананьне колькасных і асабліва якасных паказальнікаў і г. д.

Брыгадам прышлося зрабіць вывад, што заводакіраўніцтва рыхтуецца да новага парадку крэдытаваньня, але **недаволі бавымі тэмпамі.** Удзельнікі праверкі — т. т. **Мірскі, Баданіс, Вайцук, Лагунова, Шамэс, Пэўзнэр, Чаркасава, Фэлер, Левіт** і іншыя ўказалі адміністрацыі на зусім **невыстарчальную работу па гэтым пытаньні сярод усёй масы рабочых заводу.**

Адміністрацыя абяцала **сюпінаць 29 кастрычніка шырокі сход ударнікаў і зрабіць падрабязны даклад аб новых мерапрыемствах па ўзмацненьні гаспадарчага разрахунку.** На прапанове брыгад гэты сход будзе таксама скарыстаны для **перасьлічі паміж усімі брыгадамі гаспадарчага разрахунку аб выніках іх работы.**

Галоўны бухгальтар абяцаў брыгадам прыняць усе меры, каб здаць баланс на 1-га кастрычніка да тэрміну — **не пазьней 29-га кастрычніка.**

«Налёт» брыгад гаспадарчага разрахунку на адміністрацыю і бухгальтэрыю зрабіў вялікае ўражаньне. Пасьля уходу брыгад галоўны бухгальтар заявіў: «Я думаў, што гэтым пытаньнем цікавяцца толькі банкі і РСІ, аказваецца, што і брыгады гаспадарчага разрахунку ім зацікавіліся».

Умяшаньне рабочай грамадзкасьці бясспрэчна прывядзе **да паскарэньня тэмпаў падрыхтоўкі прадпрыемстваў і гаспадарчых аб'яднаньняў да новага парадку крэдытаваньня.**

Гаспадарча-разрахунковыя брыгады **іншых прадпрыемстваў** павінны **пасьледаваць добраму прыкладу ударнікаў «Бальшавіка».** Актыўны ўдзел перадавікоў-ударнікаў у справе падрыхтоўкі да новага парадку крэдытаваньня дапаможа прамысловасьці лепш і хутчэй выканаць пастанову **ЦК і СНК** аб мерапрыемствах па ўзмацненьні гаспадарчага разрахунку.

П.

Сёньня-ж прадставіць банку адпаведныя дакуманты

(З пастановы бюро менскага гаркому КП(б)Б)

БЮРО МЕНСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б, АДЗНАЧАЮЧЫ, ШТО ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ, ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ І АСАБЛІВА ГАСПАДАРЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ДАГЭТУЛЬ ЯШЧЭ НЕ РАЗГАРНУЛІ НАЛЕЖНАЙ РАБОТЫ ПА ПЕРАХОДЗЕ НА НОВЫ ПАРАДАК КРЭДЫТАВАНЬНЯ І ШТО З БОКУ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ ПРАЯЎЛЕНА НЕДАПУШЧАЛЬНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ, ПРАПАНУЕ УСІМ АБ'ЯДНАНЬНЯМ НА ПРАЦЯГУ ТРОХ ДЗЁН ЗАЦЬВЕРДЗІЦЬ ДЫРЭКТЫЎНЫЯ БАЛЯНСЫ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НА ЧАЦЬВЕРТЫ КВАРТАЛ, АФОРМІЦЬ ЗАБЕСПЯЧЭНЬНЕ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ЗВАРОТНЫМІ СРОДКАМІ І ЛІМІТАМІ НА СЭЗОННАЕ НАКАПЛЕНЬНЕ. ДЫРЭКТАРОМ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ПРАПАНАВАНА НЕ ПАЗЬНЕЙ 27-ГА КАСТРЫЧНІКА ПРАДСТАВІЦЬ У ДЗЯРЖБАНК: ПРАМФІНПЛЯН, СПРАВАЗДАЧНЫ БАЛЯНС НА 1-ГА КАСТРЫЧНІКА, ДАГАВАРЫ НА РЭАЛІЗАЦЫЮ (У НЕАБХОДНЫХ ВЫПАДКАХ І НА ЗАБЕСПЯЧЭНЬНЕ), А ТАКСАМА ЛІЧЭБОВЫЯ ВЕСТКІ АБ СУМАХ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў ДАРОЗЕ. ПАРТЫЙНЫМ ЯЧЭЙКАМ І ПРАФАРГАНІЗАЦЫЯМ ПРАПАНАВАНА ШЫРОКА ПРАПРАЦАВАЦЬ ПАСТАНОВУ ЦК УсеКП(б) І СНК АБ НОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ ПА ЎКАРАНЕНЬНІ ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ, ПОЎНАСЬЦЮ ЗАБЯСПЕЧЫЎШЫ ПАДРЫХТОЎКУ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ДА ПЕРАХОДУ З 1-ГА ЛІСТАПАДА НА НОВУЮ СЫСТЭМУ КРЭДЫТАВАНЬНЯ. МЕНАДДЗЯЛЕНЬЮ ДЗЯРЖБАНКУ ПАД АДКАЗНАСЬЦЬ ТАВ. КЕЙЛІНА ДАРУЧАНА НАЛАДЗІЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНАЕ ІНСТРУКТАВАНЬНЕ І ДАПАМОГУ ПРАДПРЫЕМСТВАМ У СПРАВЕ ПАДРЫХТОЎКІ.

БЮРО ГАРКОМУ ПАПЯРЭДЖВАЕ ЎСЕ АРГАНІЗАЦЫІ, ШТО СПРАВА ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ І ЎВЯДЗЕНЬНЯ НОВАЙ СЫСТЭМЫ КРЭДЫТАВАНЬНЯ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА СПРАВАЙ НЯ ТОЛЬКІ ДЗЯРЖБАНКУ, АЛЕ ЎСЕЙ ШЫРОКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ. ГАРКОМ ТАКСАМА ПРАПАНАВАЎ ГАСПАДАРНІКАМ ПРЫНЯЦЬ НАЛЕЖНЫЯ МЕРЫ ДА ПЕРАБУДОВЫ РАХУНКОВЫХ АПАРАТАЎ У АДПАВЕДНАСЬЦІ З НОВЫМ ПАРАДКАМ КРЭДЫТАВАНЬНЯ.

Белмяса падышло бюракратычна

Пастанова ЦК УсеКП(б)Б і СНК СССР абавязвае ўсе гаспадарчыя арганізацыі неадкладна вызначыць уласныя зваротныя сродкі. Аднак, рад устаноў і саюзаў ігнаруюць гэту пастанову.

Ня гледзячы на тое, што да канчатковага пераходу на новыя формы гаспадарчага разрахунку засталіся 4 дні, **Белптушкапрадукт, Саюзхлеб, Саюзпрам норм, Саюзмасла** і інш. сваю бязьдзейнасьць матывуюць адсутнасьцю спэцыяльных дырэктыў з цэнтру. У некаторых аб'яднаньнях гэта мерапрыемства праведзена фармальна. Так, па саюзе **Белмяса** гэта работа прароблена габінэтным парадкам бяз усякага ўдзелу прадпрыемстваў. Фінансісты з Белмяса шклалі ў аснову рэшткі ўсякага роду матар'яльных каштоўнасьцяй на становішчы на 1/X і прыкладна ў такіх-жа разьмерах устанавілі гэтыя нармальныя заносы і на чацьверты квартал, зусім не прааналізаваўшы нармальнасьць тых заносаў, якія мелися на 1/X.

З прычыны такой габінэтнай прапрацоўкі важнейшага пытаньня, як укараненьне гаспадарчага разрахунку, атрымалася тое, што менскі і гомельскі камбінаты, працуючыя здольнасьці якіх разоў у 45 менш аршанскага, атрымалі ўласныя зваротныя сродкі толькі ў паўтары-два разы менш, чым аршанскі камбінат, а па некаторых мерапрыемствах, як поўфабрыкаты і гатовы вырабы такіх-ж сумы, як і аршанскі камбінат. Характэрна, што нават на менскім камбінаце ні адзін з шматлікіх колькасьці эканамістаў і фінансістаў Белмяса ня быў накіраваны для практычнай праверкі правільнасьці вылучаных уласных зваротных сродкаў.

Большасьць фінансава-эканамічных работнікаў аб'яднаньняў і прадпрыемстваў вельмі дрэнна асьвядомлены аб пастанове ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб новых мерапрыемствах па ўкараненьні гаспадарчага разрахунку. Гэтым толькі трэба тлумачыць поўнае супакаеньне ў адсутнасьці бавых тэмпаў па ўстанаўленьні зваротных сродкаў.

Неабходна зараз-жа мабілізаваць шырокую грамадзкасьць аб'яднаньняў і прадпрыемстваў на поўнае ажыцьцяўленьне пастановы партыі і ўраду.

Асноўныя загатоўцы ў баку ад...загатовак

МАГІЛЕЎ. Магілеўскія загатоўчыя арганізацыі недаацэньваюць важнасьці жывёлазагатовак. Да гэтага часу плян жывёлазагатовак на IV квартал не падведзен яшчэ да сельсаветаў. Асноўныя загатоўцы — **райспажыўсаюз** зусім мала цікавіцца гэтай кампаніяй. Характэрна, што на спэцыяльную нараду па мяса-загатоўках, якая надаўна адбылася пры РВК, райспажыўсаюз нават не знайшоў патрэбным прысласць свайго прадстаўніка.

Такія-ж адносіны да жывёлазагатовак праяўляе і **райкалгасаюз,** які дагэтуль нічога не зрабіў для разгортваньня загатовак у калгасах.

Раённыя арганізацыі павінны неадкладна ўзмацніць работу па жывёлазагатоўках. Без адпаведнай эацікаўленасьці з боку аспоўных загатоўцаў нельга дабіцца пасьпяховага правядзеньня кампаніі. Трэба мабілізаваць вакол жывёлазагатовак увагу шырокіх мас працоўнай грамадзкасьці, разгарнуць шырокую масава-палітычную работу сярод калгасьнікаў і адпаасобнікаў.

Т.

БЕЛСЕЛЬТСЭСТ „ПЛЯНУЕ", ПАРТ'ЯЧЭЙКА ШТАМПУЕ

А. МІКУЦКІ

ЦК КП(б)Б у сваёй апошняй пастанове аб ходзе загатовак збожжа, бульбы, жывёлы і адгрузкі бульбы для пралетарскіх цэнтраў СССР зусім правільна адзначыў, што Белсельтрэст... «сваімі ўпна безадказнымі, праваапартуністычнымі, антыпартыйнымі адносінамі да загатовак і недапушчальна позьняй рассылкай плянаў загатовак (3-га кастрычніка) фактычна сарваў загатоўкі па саўгасным сыстэме ва ўстаноўленыя тэрміны».

Адначасова з гэтым ЦК прапанаваў «раённым партарганізацыям, саўгасным трэстам, Белкалгасцэнтру, Трактарацэнтру і загатоўчым арганізацыям разгарнуць самую актыўную работу вакол выкананьня плянаў загатовак, зараз-жа прыняць меры да выпраўленьня дапушчаных скажэньняў у загатоўках, спыніць гутаркі аб нерэальнасьці плянаў і ўзяцца за іх сапраўды бальшавіцкае выкананьне».

Дырэктывы даны зусім выразныя і катэгарычныя. Здавалася-б, усе арганізацыі павінны былі неадкладна мабілізаваць усе сілы для рашучага выпраўленьня дапушчаных скажэньняў. На вялікі жаль, па лініі Белсельтрэсту гэтага мы ня маем.

Пастанова ЦК КП(б)Б у партыйнай ячэйцы Белсельтрэсту не распрацавана дагэтуль. Сыгналы «Зьвязды» прайшлі міма вушэй членаў бюро ячэйкі. Усе мерапрыемствы з боку Белсельтрэсту абмежаваліся нарадай трыкутніка і вызначэньнем 11 таварышоў для пасылкі ў саўгасы для паскарэньня тэмпаў... малацьбы. Толькі тады, калі супрацоўнік «Зьвязды» прышоў даведацца, што зроблена для выкананьня пастановы ЦК і сыгналаў друку, сакратар ячэйкі Белсельтрэсту тав. Абрамчык паведаміў, што мяркуе склікаць пасяджэньне бюро ячэйкі, дае будзе абмяркоўвацца пастанова ЦК і артыкул у «Зьвязьдзе».

Прычыны такой апартуністычнай непаваротлівасьці зусім зразумелы. Сакратар партыйнай ячэйкі тав. Абрамчык, ён-жа загадчык сэктару забесьпячэньня, сам мае непасрэднае дачыненьне да ўсіх агідносьцяй у пытаньні збожжазагатовак, адданачык у пастанове ЦК.

Больш падрабязнае азнаямленьне са спраўай загатовак яшчэ больш выразна паказала, што працаўнікамі Белсельтрэсту сьвядома браўся курс на зрыў загатовак. Аб усім гэтым ведаў сакратар ячэйкі тав. Абрамчык.

Як-жа працаўнікі Белсельтрэсту рыхтавалі гэты зрыў? На дырэктыве Белсельтрэсту пачалося складаньне харчовых і фуражных балянсаў на нізох, у саўгасах. Рад саўгасаў гэтыя балянсы складалі з поўнай безадказнасьцю, з рвацкай тэндэнцыяй не паказаць ніводнага кілёграму лішкаў. Для гэтага бесаромна павялічваліся нормы для харчаваньня рабочых і служачых саўгасаў.

Прыведзем пару прыкладаў. Саўгас «Рудакова» на харчаваньне аднаго рабочага ў месяц выначае 21,7 кгр. жытняй мукі замест 17,4 кгр. паводле нормы, установленай для саўгасаў. Саўгас «Новы шлях» вызначае на аднаго рабочага на месяц 34 кгр. печанага хлеба замест 24 кгр. паводле нормы і для служачых 31 кгр. замест 12 кгр. Такія балянсы нават і ў Белсельтрэсьце прызналі нерэальнымі.

На выпраўленьне гэтых яўна рвацкіх балянсаў быў мабілізаваны ўвесь апарат Белсельтрэсту, але выпраўленьне пасьля некалькіх дзён працы было прызнана безнадзейным. І тады, паводле распрацаваньня былога дырэктара тав. Грэбэнчыка, пры маўклівай згодзе сакратара партячэйкі тав. Абрамчыка, плянавая частка Белсельтрэсту прыступіла да складаньня свайго... рвацкага балянсу.

Услужлівыя плянавікі Белсельтрэсту выкарысталі ўсе свае здольнасьці для таго, каб даказаць, што ніякіх лішкаў па сыстэме Белсельтрэсту няма, што наадварот самім саўгасам ня хопіць збожжа, што ім трэба даць у нараду цэнтралізаванага снабжэньня немалую колькасьць збожжа.

Вось як выглядае гэты па-шкодніцку складзены баланс.

На харчаваньне рабочых, служачых, утрымацэнцаў і рабочых прыжывальнікаў (розная роду школы) патрэбна для саўгасаў занарадзіць у нараду цэнтралізаванага снабжэньня... 38.182,94 цэнтн. жыта і 141,43 цэнтн. ячменю. Якая чульлівая дакладнасьць! Як шчыра пастараліся плянавікі, каб дагадзіць свайму паважанаму начальству! Нават сотыя часткі цэнтнэраў улічаны! Улічаны ўсе дробязі для таго, каб больш сарваць з дзяржавы.

Ячменю не хапае 141,43 цэнтн. Кіраўнікі Белсельтрэсту разумеюць, што Саюзхлеб можа і ня даць такой дробязі. А таму вырашаюць: замест ячменю скарыстаць на крупы ішаніцу. Адным словам работу павялі так, каб ня здаць дзяржаве нічога.

А можа авёс могуць здаць саўгасы? Так, яны могуць здаць, аб гэтым гавораць паведамленьні самі саўгасаў, але... балянс трэсту сваімі лічбамі выразна пратэстуе: 4.427,93 цэнтн. аўса неабходна дасласць саўгасам з цэнтралізаваных фондаў на корм... коням.

Ці ведала аб усім гэтым парт'ячэйка? Ці рэагавала? Як?

Так, ведала і рэагавала, але як. Даведаўшыся аб такім «любвеобильном»... для кулака балянсе, некаторыя саўгасы, хворыя кулацкімі тэндэнцыямі, зараз-жа пасылалі заяўкі ў Белсельтрэст.

Аднаму не хапае 50 тон жыта, другому — 40, трэцяму — 4 і г. д. Загадчык сэктару забесьпячэньня (ён-жа сакратар ячэйкі КП(б)Б) тав. Абрамчык накладае рэзалюцыю: «Завесьці сьпіс адчуваючых патрэбу ў хлебе», «уключыць пры разьмеркаваньні фондаў», «занарадзіць ішаніцы в ближэйшага саўгасу 2 тоны».

Складаецца цэлы сьпіс «адчуваючых патрэбу ў хлебе» — 38 саўгасаў, разам на 310 тон збожжа. Тав. Абрамчык падпісвае гэты сьпіс і накіроўвае аддзяленьню Саюзхлеба з просьбай «выдаць для нашай сыстэмы 310 тон».

Аднак, Саюзхлеб ня выдаў і ня выдасьць. Аддзяленьне Саюзхлеба забясьпечвае хлебам спэцыялізаваныя саўгасы, напрыклад, ільнаводча-канаплявочыя сыстэмы, Сьвінавода і г. д., якія ня маюць збожжавых пасеваў. Саюзхлеб бяры на сваё забесьпячэньне толькі нова-арганізаваныя саўгасы сыстэмы Белсельтрэсту, якія яшчэ не рабілі пасеваў. Гэта — зусім правільна.

Саўгасы ў гэтым годзе засеялі значныя плошчы збожжавых культур. У асноўным — ураджай сярэдні. Заданьне па загатоўках у 4.500 тон для ўсёй саўгаснай сыстэмы — нявялікае. З гэтага ліку на саўгасы Белсельтрэсту падае 2.340 тон. Заданьне зусім рэальнае і выкапаць яго саўгасы змогуць без асаблівых труднасьцяй.

Аднак, в прычыны апартуністычнага кіраўніцтва Белсельтрэсту, дагэтуль адана толькі 152,6 тоны жыта і пшаніцы. Плян загатовак выкананы на 4,6 проц.

На партыйных ячэйках, прафсаюзных арганізацыях, дырэкцыі і ўсіх рабочых саўгасаў ляжыць адказнейшая задача— у бліжэйшы час выканаць плян збожжазагатовак.

Раённыя партарганізацыі таксама нясуць адказнасьць за выкананьне гэтай задачы.

Зараз-жа неабходна так арганізаваць работу, каб дакладна вызвіць усе лішкі саўгасаў і неадкладна здаць іх дзяржаве, не абмяжоўваючыся толькі выкананьнем плян

Год выданьня—XV
№294 (1200)
Серада, 28 кастрычніка
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—6-27,—сакратар—10-74, парт.сакратар—13-80, прамысл.—13-80, сяв. замаг.—6-19, масы-інфарм.—6-19, замаг. інфарм.—6-19, пашы рэдактар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, адказны выдавец—7-81, адказны сакратар—7-31.

Японскія імпэрыялісты „гаспадарнічаюць“ у Манчжурыі

ВОЙСКІ АКУПАНТАЎ ЗАЙМАЮЦЬ ТАОНАНЬ

Кітайскія чыгункі ня выгадныя Японіі разбураюцца.—Паўднёва-Манчжурская чыгунка злучаецца з японскімі партамі.—Далейшае наступленьне японскіх войск па лініі Цыцыкар-Таонань.

„Пад відам барацьбы з бандытамі“

ТОКІЁ, 26. Японская газэта «Хоці» паведамляе, што паводле даных галоўнай канторы Паўднёва-Манчжурскай чыгункі, ў Мукдэне станцыя Молін (Сыцінгай Таонаньская дарога) «падпала 21-га кастрычніка нападу тысячнага атраду кітайскіх салдат, якія перарэзалі правады». Той-жа атрад «напаў» на станцыю Саплін. Газэта сьцьвярджае, што розныя кітайскія атрады занялі некалькі вучастакаў чыгункі між Сыцінгаем і Джэнзатунем. У выніку чыгуначны рух перарваны. З Чанчуня пад відам задушэньня дзеяньняў бандытаў пасланы японскія войскі.

У пошуках „поўнага разуменьня“

ТОКІЁ, 26. Газэта «Токіё Асахі» паведамляе: «Учора савет міністраў пастанавіў адправіць спэцыяльныя місіі да розных дзяржаў з мэтай дабіцца поўнага разуменьня японскай пазыцыі ў манчжурскім пытаньні»

Анэксія манчжурскіх чыгунак Японіяй

ТОКІЁ, 27. Як паведамляюць з эканамічных колаў стварэньне кітайска-манчжурскай чыгуначнай камісіі, «адкрывае значныя пэрспэктывы для Паўднёва-Манчжурскай чыгункі». Гэта камісія, якая зьяўляецца выканаўчым органам ЯПОНСКІХ АКУПАНТА�Ў, ПРАВЯЛА РАД ПАСТАНОЎ, ЯКІЯ МАЮЦЬ НА МЭЦЕ ПОЎНАЕ ЗАДАВАЛЕНЬНЕ ЯПОНСКІХ ПАТРАБАВАНЬНЯЎ У АДНОСІНАХ ДА ЧЫГУНАЧНАЙ СЕТКІ Ў МАНЧЖУРЫІ. Забаронена правядзеньне паралельных шляхоў па Нова-Манчжурскай чыгунцы. Гэта чыгунка злучаецца з японскімі партамі.

Полк выступіў у поўным складзе

ТОКІЁ. 29-ы полк, які знаходзіцца ў Чаньчуне, учора ў поўным складзе **выступіў праз Сыцінгай-Чжэнцзятунь для заняцьця** Таонаня. Па словах агенцтва «Дэмпо Цусін» атрад палка ўжо дасягнуў Таонаня, які знаходзіцца далёка ад зоны Паўднёва-Манчжурскай чыгункі.

Ваеншчына апраўдвае адпраўку войск

ТОКІЁ, 26. Паводле паведамленьняў агенцтва «Сімбун Рэнга» вайсковае міністэрства ў афіцыяльным камунікэ **ап раўдвае адпраўку японскіх войск у Таонань** тым, што ў гэтым раёне ня толькі «разабраны чыгуначны шлях, але кітайскія ваенныя атрады забралі і вывезьлі ўсе матар'ялы, неабходныя для аднаўленьня чыгункі». Усе чыгуначнікі разьбегліся.

У Лодзі пачалася ўсеагульная забастоўка тэкстыльшчыкаў

ВАРШАВА, 27. УЧОРА Ў ЛОДЗІ РАСПАЧАЛАСЯ ЗАБАСТОЎКА ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ. КІРУЕ ЗАБАСТОЎКАЙ СТАЧАЧНЫ КАМІТЭТ, ВЫБРАНЫ САМІМІ РАБОЧЫМІ МАСАМІ.

НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ БАСТУЕ 20 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК. ПАМІЖ РАБОЧЫМІ ВЫБУХАЮЦЬ СУТЫЧКІ. ПАМІЖ РАБОЧЫМІ ВЫБУХАЮЦЬ СУТЫЧКІ ПАМІЖ РАБОЧЫМІ І ЎЗБРОЕНЫМІ ДРУЖЫНАМ